**Н.Я. Анапрэенка**
Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальная бібліятэка Беларусі»

УДК 76.02:769

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА МАКСІМА ВАШЧАНКІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА

*Расказваецца пра дзейнасць і мастацкую спадчыну беларускага друкара і гравёра М. Вашчанкі ў кантэксце надрэгіянальных і наднацыянальных культурных сувязей. Разглядаюцца кнігі, выдадзеныя пад кіраўніцтвам гэтага дзеяча, апісваюцца асаблівасці яго ўласных твораў.*

Ключавыя словы: *друкарня, медзярыт, іканаграфія, іканапісныя традыцыі, рэмінісцэнцыя, індывідуальнасць, наватарства.*

Максім Вашчанка (1650-я – 1708) – беларускі друкар і гравёр па медзі (аўтар каля 50 медзярытаў) – пакінуў багатую творчую спадчыну. Адзін з заснавальнікаў Магілёўскай школы гравюры і адзін з арганізатараў Магілёўскай брацкай друкарні.

Звестак пра яго захавалася няшмат. Вядома, што ён вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, дзе атрымаў ступень бакалаўра філасофіі і вольных мастацтваў (1672), званне магістра навук (1673).

Друкарскую дзейнасць пачаў у Слуцку, дзе ў 1678 г. зрабіў ілюстрацыі да кнігі «Манархія Турэцкая, апісаная Рыко» (17 падпісных медзярытаў М. Вашчанкі – копіі гравюр французскіх мастакоў С. Леклерка і Н. Кашэна для парыжскага выдання дадзенай кнігі). Гэта работа стала важным этапам у фарміраванні творчай індывідуальнасці маладога мастака: «…з аднаго боку, тут адчуваецца пэўны вучнёўскі падыход, з другога – пачатак фарміравання ўласнага мастацкага почырку. <…> Нягледзячы на пэўныя памылкі ў малюнку і перспектыве, ён упэўнена перадаў аб’ём, а дзякуючы зведзенай да мінімуму градацыі тону нарэдка назіраюцца напружанасць і кантраснасць. Падчас працы над ілюстрацыямі ў М. Вашчанкі сфарміраваўся своеасаблівы іканаграфічны тыпаж героя» [2, с. 211]. Даследчык М.М. Шопіна падкрэслівае, што беларускі майстар стварыў свецкі цыкл графічных работ з дакументальнай дакладнасцю і незвычайным для таго часу рэалізмам [3, с. 449]. Такім чынам, з самага пачатку сваёй дзейнасці М. Вашчанка заявіў пра сябе як арыгінальны і самабытны майстар, што прывяло да стварэння яркіх і самабытных помнікаў мастацтва.

З 1680-х гг. ён працаваў у Магілёўскай брацкай друкарні (з 1690-х гг. да 1708 г. з’яўляўся яе кіраўніком).

У 1693 г. убачыла свет кніга «Акафісты і каноны». М. Вашчанка выканаў для яе каля 30 медзярытаў, характэрнай асаблівасцю якіх з’яўляецца «цесная сувязь з традыцыямі заходнееўрапейскага мастацтва, якая праявілася як у асаблівасцях іканаграфіі многіх сюжэтаў, так і ў стылістыцы гравюр» [2, с. 211]. Кожная ілюстрацыя дадзена на поўную старонку. Усе творы зроблены на евангельскія тэмы.

Усяго выйшла 16 выданняў, надрукаваных М. Вашчанкам. На некаторых з іх маюцца адзнакі «з друкарні Максіма Вашчанкі». Гэта была літургічная і павучальная літаратура рэлігійнага зместу. Сярод кніг адзначым наступныя:

– «Диоптра, или Зерцало живота во всем мире сем человеческого» (1698) – сачыненне (у выглядзе павучанняў і настаўленняў) візантыйскага манаха XI ст. Філіпа Манатропа («Пустэльніка»), аснову якога складае дыялог Душы-пані і Цела-служанкі, падчас якога пастуліруецца адзінства матэрыяльнага і духоўнага скрозь прызму хрысціянска-неаплатанічнай канцэпцыі адзінага быцця. У цэлым змест гэтага літаратурнага помніка накіраваны на гарманічнае ўспрыняцце навакольнай рэчаіснасці і адрасаваны як рэлігійным дзеячам, так свецкаму насельніцтву;

– «Ирмолой, или Осмогласник…» (1700) – богаслужбовая кніга, адрэдагаваная і дапоўненая Іаанам Дамаскіным, багасловам, філосафам, паэтам, сістэматызатарам хрысціянскага вучэння.

Выдатны беларускі майстар таксама друкаваў творы знакамітых украінскіх праваслаўных царкоўных і грамадска-палітычных дзеячаў:

– «Небо новое с новыми звездами сотворенное» (1699) – сачыненне, прысвечанае падзеям і цудам, якія адбываліся з Прасвятой Багародзіцай ці людзьмі па Яе волі. Аповеды, сабраныя ў кнізе, праслаўлялі Бога, пацвярджалі сапраўднасць хрысціянскіх догмаў, сцвярджалі аўтарытэт царквы, настаўлялі прыхаджан на правільны шлях. Аўтар – Іанікій Галятоўскі, рэктар Кіева-Магілянскай калегіі, пісьменнік, вучоны-энцыклапедыст. Магілёўскае выданне гэтага твора, як адзначае даследчык З. Ярашэвіч-Пераслаўцаў, карысталася вялізнай папулярнасцю і мела шырокую аўдыторыю, пра што сведчаць дарчыя запісы, копіі, нататкі на захаваных асобніках [4, с.125];

– «Перло многоценное» (1699) – зборнік артыкулаў рэлігійнага зместу (у вершах і прозе), які складаецца з пропаведзяў, казанняў, а таксама разважанняў і павучанняў пра Ісуса Хрыста, Святую Троіцу, Багародзіцу, анёлаў, апосталаў, святых і інш. Кніга мела пазнавальнае і эстэтычна-выхаваўчае значэнне. Аўтар – Кірыла Транквіліён Стаўравецкі, чарнігаўскі архімандрыт, прапаведнік, пісьменнік, паэт, вучоны.

М. Вашчанка інтэнсіўна шукаў новыя формы мастацкай выразнасці. Яго выданні былі аздоблены разнастайнымі арнаментамі, застаўкамі, ініцыяламі; выкарыстоўваўся друк у дзве фарбы; пераважалі малыя (нават мініяцюрныя) фарматы кніг. Для беларускага майстра кніга выконвала не

толькі выхаваўчыя, пазнавальныя, асветніцкія функцыі, але была і творам мастацтва, таму ён імкнуўся да найлепшага упрыгожання кожнага (і рэлігійнага, і свецкага) выдання.

Дзейнасць М. Вашчанкі мае вялікае значэнне ў гіторыі беларускага кірыліцкага кнігадрукавання: мастак-наватар першы выкарыстаў тэхніку разцовага медзярыту, першы пакінуў на гравюры свой подпіс; яго ілюстрацыі вызначаліся свецкім характарам. Даследчыкамі адзначаецца наступнае: «Не апошнюю ролю ў з’яўленні медзярытаў у брацкіх выданнях адыграла тое, што арганізатарам і арандатарам друкарні напачатку быў Максім Вашчанка, які набыў мастацкую адукацыю ў Вільні і авалодаў тэхнікай гравюры на метале ў віленскім гуртку графікаў пад кіраўніцтвам вядомага майстра Аляксандра Тарасевіча. Таму цалкам натуральна, што вярнуўшыся ў Магілёў і атрымаўшы ў арэнду брацкую друкарню, ён імкнуўся прымяніць свае навыкі» [2, с. 208].

Яго творчасць адрозніваецца ўласнай індывідуальнасцю і непаўторным каларытам: выкарыстоўваючы лепшыя здабыткі тагачаснага заходнееўрапейскага мастацтва, беларускі майстар у сваёй дзейнасці абапіраецца на нацыянальныя жывапісныя і іканапісныя традыцыі. «Атрымаўшы сістэматычную мастацкую адукацыю, валодаючы разнастайнымі мастацкімі ведамі і шырокай эрудыцыяй, М. Вашчанка ў большай ступені, чым яго калегі, быў арыентаваны на сучаснае мастацтва Заходняй Еўропы. Ён амаль што быў адзінай фігурай, якую ў тыя часы з усёй адказнасцю можна назваць дзеячом “на мяжы культур”. Усё сваё жыццё мастак імкнуўся звязаць сваю творчасць з еўрапейскім мастацтвам. Аднак відавочна, што стылявыя прынцыпы барока не сталі арганічнай часткай творчасці мастака. Знітоўваючыся з традыцыямі народнага прымітыва, рэмінісцэнцыямі сярэдневяковага мастацтва, яны часцей за ўсё выступаюць у ролі ўмела падабраных “цытат”» [1, с. 523] – слушна адзначае А.М. Пікулік.

Гравюры М. Вашчанкі вылучаюцца ўмелай кампаноўкай шматфігурных, складана арганізаваных сцэн, кантрастамі, дакладнымі светлаценявымі пераходамі. Гэта высокамастацкія ўзоры кніжнай графікі, якія ўтрымліваюць у сабе каштоўны гістарычны і культурны матэрыял і выконваюць павучальна-асветніцкую функцыю – шматтыражныя друкаваныя кнігі былі больш даступныя шырокаму колу чытачоў, чым рукапісныя, а гравюра выступала даволі дзейсным сродкам распаўсюджвання тагачасных гуманістычных ідэй у грамадстве.

Дзейнасць М. Вашчанкі аказала значны ўплыў на іншых мастакоў Магілёўскай брацкай друкарні і ў цэлым на фарміраванне вобразна-стылістычных асаблівасцей магілёўскіх кніжных гравюр, дзе «знітаваліся старажытныя традыцыі з новымі ўздзеяннямі еўрапейскага барока, асэнсаванымі на ўзроўні народнай эстэтычнай свядомасці» [2, с. 208].

Каб падвесці вынік вышэйсказанаму, адзначым наступнае. Выдавецкая і мастацкая дзейнасць М. Вашчанкі развівалася ў кантэксце міжкультурных узаемадачыненняў, убіраючы ў сябе асноўныя тэндэнцыі тагачаснага грамадска-культурнага жыцця і мела важнае значэнне для станаўлення і развіцця беларускага кірылічнага друку. Сведчаннем яркай творчай індывідуальнасці стала яго друкарская дзейнасць, а таксама графічныя работы і ілюстрацыі, выкананыя адпаведна з патрабаваннямі часу.

1. Пікулік, А. М. Максім Вашчанка і яго роля ў развіцці беларускага брацкага кірыліцкага кнігадрукавання / А. М. Пікулік // XIV Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвященные Дням славянской письменности и культуры : материалы чтений «Диалог науки и религии в едином процессе познания мира и человека», Минск, 22–24 мая 2008 г. / Ин-т теологии им. свв. Мефодия и Кирилла, Бел. гос. ун-т культуры и искусств ; отв. ред. и сост. А. Ю. Бендин. – Минск : Зорны верасень, 2009. – С. 518–524.

2. Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку / склад. А. А. Суша, фота А. П. Дрыбаса, А. Р. Шаблюка. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. – 248 с.

3. Шопина, М. М. «Terra incognata»: слуцкое издание «Монархии турецкой» из фондов Национальной библиотеки Беларуси / М. М. Шопина // Берковские чтения – 2013. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Международной научной конференции, Минск, 16–17 мая 2013 г. – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; М. : ФГБУ науки НИЦ «Наука» РАН, 2013. – С. 447–450.

4. Ярашэвіч-Пераслаўцаў, З. Кірылічныя выданні з друкарняў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII ст. / З. Ярашэвіч-Пераслаўцаў // Arche. Пачатак. – 2020. – № 4. – С 5–271.

**С.Ф. Бут-Гусаім**
Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

УДК 821.161.3-2:811.161.3’373.23

## ІМЕНАСЛОЎ ГІСТАРЫЧНАЙ ДРАМЫ ЗІНАІДЫ ДУДЗЮК “СКАРЫНА З ПОЛАЦКА”

*Мэта артыкула – сістэматызацыя структуры анамастычнай прасторы гістарычнай драмы берасцейскага аўтара Зінаіды Дудзюк з улікам гістарычных традыцый беларускага іменаслову; устанаўленне характару экстралінгвістычных прымет, што знайшлі адлюстраванне ў анамастыконе мастацкага твора. У працы прадстаўлена тэматычная класіфікацыя паэтонімаў. Антрапонімы разгледжаны як значымыя інфарматыўныя адзінкі, у семантычную структуру якіх уключаюцца прагматычны складнік, стылістычныя, эмацыйныя, ацэначныя,*